УДК 378 (06)

# 1956 г.: ДРУГІ ВЫПУСК АГРАНАМІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА ГРОДЗЕНСКАГА СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАГА ІНСТЫТУТА

**В.У. Галубовіч, В.П. Галубовіч**

УА "Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт" (Рэспубліка Беларусь, 230008, г. Гродна, вул. Церашковай, 28; e-mail: ggau@ggau.by)

Анатацыя. У артыкуле прадстаўлены вынікі рэканструкцыі калектыўнага партрэта другога выпуску агранамічнага факультэта Гродзенскага сельскагаспадарчага інстытута.

Ключавыя словы: адукацыя, сельская гаспадарка, студэнт, універсітэт.

# 1956 г.: ВТОРОЙ ВЫПУСК АГРОНОМИЧЕСКОГО ФАКУЛЬТЕТА ГРОДНЕНСКОГО СЕЛЬСКОХОЗЯЙСТВЕННОГО ИНСТИТУТА

**В.В. Голубович, О.П. Голубович**

УО "Гродненский государственный аграрный университет" (Республика Беларусь, 230008, г. Гродно, ул. Терешковой, 28; e-mail: ggau@ggau.by)

Аннотация. В статье представлены результаты реконструкции коллективного портрета второго выпуска агрономического факультета Гродненского сельскохозяйственного института.

Ключевые слова: образование, сельское хозяйство, студент, университет.

# 1956: THE SECOND AGRONOMICAL DEPARTMENT GRADUATES OF GRODNO AGRICULTURAL INSTITUTE

**V.U. Halubovich, V.P. Halubovich**

EI "Grodno State Agrarian University" (Grodno, 230008, 28, Tereshkova st.; e-mail: ggau@ggau.by)

Summary. The article presents the results of the collective portrait reconstruction of the second agronomical department graduates of Grodno agricultural institute.

Key words: education, agriculture, student, university.

На першы курс Гродзенскага сельскагаспадарчага інстытута (далей – ГСГІ) у 1951 г. было залічана 175 чалавек [1, с. 5]. Большасць з іх апынулася на агранамічным факультэце і, адпаведна, сярод выпускнікоў 1956 г. дамінавалі вучоныя аграномы.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

*Колькасць выпускнікоў.* Фармальнай крыніцай інфармацыі пра выпускнікоў з'яўляецца архіўная справа, пачатая ў інстытуце ў 1951 г. і закончаная ў 1956 г. [2]. Зводны рэестр да гэтай справы ўтрымлівае спіс з 90 прозвішчаў, але фактычна дакументы адносяцца да 89 асоб (за кошт паўтору). Акрамя таго, у трох асабістых справах адсутнічаюць абавязковыя выпіскі з загада дырэктара ГСГІ пад № 36 ад 3.04.1956 г. аб рашэнні Дзяржаўнай кваліфікацыйнай камісіі і выдачы дыплома. У архіўным томе пагінацыя непарушана, таму трэба думаць, што гэтых трох асоб з агульнага спіса нельга лічыць скончыўшымі інстытут. Такім чынам, дакументальна пацвярджаецца, што другі выпуск вучоных аграномаў складаўся з 86 чалавек.

На першы курс агранамічнага факультэта ГСГІ у 1951 г. падалі дакументы 89 чалавек. За пяць гадоў студэнцкі калектыў змяніўся мінімальным чынам: у 1952-1953 гг. дзве студэнткі перавяліся ў Гродна з Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках.

*Узрост.* Спектр гадоў нараджэння выпускнікоў агранамічнага факультэта 1956 г. выяўляў даволі значную разбежку – ад 1922 г. да 1934 г. Розніца магла адыгрываць сваю ролю ў камунікацыі ў межах калектыву, але ўзроставы падзел нівеліраваўся нязначнай колькасцю тых, хто належаў да старэйшай групы (адзін студэнт быў 1922 г. нараджэння, тры студэнты – 1925 г. і г.д.). Большасць выпускнікоў 1956 г. нарадзіліся ў 1930–1932 гг., адпаведна, на момант падачы заяваў на першы курс былі ва ўзросце ад 19 да 21 гадоў. Толькі адзін студэнт быў 1934 г. нараджэння.

*Пол.* Праца агранома па інерцыі лічыцца мужчынскай, але ніякіх абмежаванняў, акрамя традыцыйных стэрэатыпаў, за гэтым няма. Пра гэта сведчыць склад выпускнікоў аграфака 1956 г. Асобы жаночага полу ў складзе студэнцкага калектыву складалі даволі заўважны адсотак. З 89 чалавек, чые дакументы апынуліся ў архіўным томе са справамі выпускнікоў, было 37 дзяўчын. Аднак фактычна ад гэтай лічбы трэба адняць тых трох асоб, адносна якіх няма выпісак аб сканчэнні інстытута, што змяншае колькасць прадстаўніц жаночага полу да 34. Тым не менш, неабходна канстатаваць, што прыгожая палова чалавецтва была прадстаўлена ў выпуску аграфака 1956 г. больш чым годна і складала 40%.

*Нацыянальнасць.* Згадка пра нацыянальнасць была адным з пунктаў аўтабіяграфічных звестак, якія падаваліся абітурыентамі пры паступленні. Пераважная большасць выпускнікоў 1956 г. ідэнтыфікавалі сябе як беларусы, нават калі асабістыя звесткі гэтаму не вельмі адпавядалі. Пэўны працэнт выпускнікоў складалі рускія. Сярод выпускнікоў былі палякі, украінцы і яўрэі. Некаторыя, свядома ці не,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

абыходзіліся без указання на сваю этнічную прыналежнасць. У большасці сваёй такія асобы паходзілі з усходніх абласцей тагачаснай БССР ці з РСФСР. Этнічны склад студэнтаў-аграномаў не даваў падстаў для супярэчнасцей на нацыянальнай глебе. Адзначыць можна таксама тое, што ні адзін з беларусаў не падаў заяву па-беларуску, пры тым што многія ў аўтабіяграфіях выказвалі захапленне савецкай уладай, якая дала ім магчымасць вучыцца на роднай мове.

*Месца нараджэння і жыхарства.* Месца нараджэння з'яўляецца важным пунктам біяграфіі кожнага чалавека. Студэнты-аграномы другога выпуску ГСГІ пераважна былі ўраджэнцамі беларускіх вёсак, але былі і тыя, хто нарадзіўся ў сельскай мясцовасці у Маскоўскай, Варонежскай і Курскай абласцях. Толькі адзінкі з ліку выпускнікоў аграфака 1956 г. нарадзіліся ў беларускіх гарадах (Гродна, Скідзель, Віцебск, Полацк, Орша). Сярод выпускнікоў былі таксама ўраджэнцы Нара-Фамінска, Тбілісі, Барнаула, Уфы, Севастопаля, Краматорска, Лодзі, але, так ці інакш, усе яны на момант паступлення пражывалі на тэрыторыі БССР. Сярод студэнтаў-выпускнікоў былі тыя, хто ў свой час разам з бацькамі пераехаў у СССР з Польскай Народнай Рэспублікі.

Досыць паказальна выглядае геаграфія месца жыхарства студэнтаў-аграномаў, якія вучыліся ў ГСГІ у 1951–1956 гг. Сельскагаспадарчы інстытут у Гродне быў адчынены ў значнай ступені для таго, каб забяспечыць кадрамі Заходнюю Беларусь, дзе на пачатку 1950-х гадоў скончыўся пераход да кіруемай дзяржавай калектыўнай формы гаспадарання [3, с. 23]. Але першы вялікі набор не вельмі адпавядаў гэтым мэтам. Зыходзячы з актуальнага на момант падачы дакументаў *месца жыхарства*, сярод студэнтаў-аграномаў былі прадстаўнікі ўсіх, без выключэння, абласцей БССР, якія існавалі да і пасля адміністрацыйна-тэрытарыяльных змен у 1954 г. Іншыя рэгіёны СССР былі прадстаўлены толькі Маскоўскай вобласцю РСФСР.

*Адукацыя.* Для паступлення ў ВНУ БССР патрабавалася пасведчанне аб сканчэнні сярэдняй школы з 10-гадовым тэрмінам навучання. Ураджэнцы Заходняй Беларусі мелі вопыт навучання ў польскіх школах да 1939 г. Нягледзячы на розніцу ва ўзросце, большасць тых, хто паступаў у 1951 г., атрымалі пасведчанне аб сярэдняй адукацыі ў гэтым жа годзе, у тым ліку ў вячэрне-завочных школах. Нязначная колькасць выпускнікоў 1956 г. мела сярэднюю спецыяльную адукацыю па профілю ГСХІ – малодшага агранома. Гэта былі выпускнікі Краснабярэжскага, Жыровіцкага, Смалянскага, Сернаводскага і Рыльскага сельскагаспадарчых тэхнікумаў, Бабруйскай трохгадовай агранамічнай школы. Дарэчы, некаторыя

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

выпускнікі атрымалі дыпломы з адзнакай, што дазволіла ім паступаць у ГСГІ без адпрацоўкі.

*ГСГІ як альтэрнатыва і лёс.* Сярод тых, хто скончыў у 1956 г. агранамічны факультэт, былі тыя, хто ад пачатку жадаў атрымаць сельскагаспадарчую адукацыю, але не прайшоў па конкурсе ў іншыя профільныя ВНУ СССР: Ціміразеўскую сельскагаспадарчую акадэмію, Ленінградскі сельскагаспадарчы інстытут. ГСГІ стаў для іх другім і вызначальным шансам на вучобу. Але, дзеля справядлівасці, трэба адзначыць, што далёка не ўсе, хто ў 1956 г. атрымаў дыплом вучонага агранома ў ГСГІ, планавалі звязаць сваю будучыню з сельскай гаспадаркай. Так, на аргафаку ГСГІ ў 1951 г. апынуліся тыя, хто не прайшоў па конкурсе ў Беларускі палітэхнічны інстытут імя І.В. Сталіна, Мінскі юрыдычны інстытут, Магілёўскі дзяржаўны педагагічны інстытут, Мазырскі дзяржаўны настаўніцкі інстытут, Гродзенскі дзяржаўны педагагічны інстытут, Кіеўскі дзяржаўны стаматалагічны інстытут.

*Сацыяльнае паходжанне.* Ідэалагічны фільтр, які выстаўляла савецкая ўлада ў адносінах да прэтэндэнтаў на сацыяльны рост, прадугледжваў дэкларацыю не толькі асабістых звестак, але і даных пра паходжанне. Асобы, якія падавалі дакументы для паступлення ў савецкія навучальныя установы, не маглі гэтага не разумець, таму імкнуліся зрабіць акцэнт на “правільнасць” свайго паходжання. Аграрная спецыфіка інстытута фармальна прадвызначала, што туды будуць паступаць выхадцы з вёскі. Выпуск 1956 г., у пэўнай ступені, пацвярджаў гэта: большая частка вучоных аграномаў сапраўды нарадзілася ў сялянскіх сем’ях. Многія спецыяльна падкрэслівалі бядняцкі статус бацькоў (батракі і г.д.), хаця былі і тыя, хто не саромеўся свайго серадняцка-сялянскага паходжання. Але аграномамі жадалі стаць не толькі дзеці сялян. Шмат было тых, хто паходзіў з сямей служачых, вайскоўцаў, настаўнікаў, працаўнікоў культуры. Крайнія спектры па тагачаснай сацыяльнай іерархіі прадстаўлялі, з аднаго боку, тыя, чые бацькі былі звязаны з рэлігійнай дзейнасцю (арганіст касцёла, праваслаўны святар), а з іншага – тыя, чые бацькі працавалі ў савецкіх дзяржустановах на кіраўнічых пасадах (старшыня гродзенскага гарвыканкама). Асобна трэба адзначыць тое, што бацькі некаторых выпускнікоў належалі да палітычнага актыва міжваенных часоў, у прыватнасці, былі сябрамі Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі.

*Вайна*. Выпуск 1956 г. адбыўся праз 12 год пасля вызвалення Гродзеншчыны ад нацыстскай арміі. Падзеі Другой сусветнай вайны прайшлі праз жыццё ўсіх выпускнікоў. Большасць з іх вайну перажыла



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

ў дзіцячым ці падлеткавым узросце, прычым на акупаванай тэрыторыі Беларусі. Некаторыя шчыра прызнаваліся, што “не ўдзельнічалі” ў Вялікай Айчыннай вайне, але былі і тыя, хто ўдзельнічаў у партызанскай барацьбе, не зважаючы на ўзрост. Былі сярод выпускнікоў тыя, каго немцы вывезлі на прымусовую працу. Аднаго з будучых аграномаў у 1945 г. вызвалілі амерыканскія войскі ў Аўстрыі, іншага – савецкія войскі ў Германіі. У час вайны у многіх загінулі бацькі. Некалькі старэйшых па ўзросце вупускнікоў былі ўдзельнікамі вайны, мелі раненні.

*Высновы.* Выпуск арганамічнага факультэта ГСГІ 1956 г. стаў першым масавым выпускам. Прыведзеныя даныя сведчаць, што ГСГІ з першых гадоў дзейнасці ператварыўся ў установу, якая рыхтавала спецыялістаў з ўсёй і для ўсёй Беларусі. Студэнцкі калектыў гродзенскага аграфака быў шматнацыянальным, але яго аснову складалі беларусы. Вельмі важна, што на факультэце вучылася шмат тых, хто свядома абіраў прафесію агранома. Агранамічны факультэт ГСГІ прываблівае прадстаўнікоў розных сацыяльных груп тагачаснага грамадства, даваў магчымасць атрымаць адукацыю нават тым асобам, у чыёй лаяльнасці савецкія ўлады былі няўпэўненыя. Выпускнікі 1956 г., як старэйшыя, так і малодшыя па ўзросце, былі аб’яднаныя агульным жыццёвым выпрабаваннем – вайной, якая ў рознай ступені, але закранула ўсіх без выключэння.

Спецыяльна трэба адзначыць, што выпускнікі аграфака ГСГІ 1956 г. унеслі свой уклад у развіццё як беларускай эканомікі, так і сельскагаспадарчай навукі. Кандыдатамі сельскагаспадарчых навук сталі *А.П. Пузанкоў (1967 г.) і В.А. Белбухаў (1978 г.).*

КРЫНІЦЫ

1.Гродненский государственный аграрный университет 1951–2001. 50 лет. – Гродно: ГОУПП «Гродненская типография», 2001. – 224 с.

2.Архіў УА “ГДАУ”. – Асабістыя справы студэнтаў аграфака выпуску 1956 года. – Спр. № 03.

3. ALMA MATER: Гродненский государственный аграрный университет. Традиции, история, современность. – Гродно: Гродненская типография, 2011. – 128 с.

**ДАДАТАК**

**Спіс выпускнікоў агранамічнага факультэта 1956 г. паводле архіўнага рэестра [2, аркушы без нумацыі].**

*Антонаў У.Я., Ародзь Э.С., Арцюх Г.Д., Алісейка Н.К., Альфер Д.П., Бернат В.І., Бранавец (Касцюк) М.І., Бегер А.І., Белбухаў В.А., Біч В.А., Верамчук Б.Д., Васілюк Ц.І., Гайко І.Ф., Грышчанка Л.М., Глазкін Л.Р., Грэчка (Духовіч) Л.І., Даўгун Л.А., Жаўняк Р.Ф., Жамойдзік Р.І., Жывулька Л.М., Захаранка І.П., Заблоцкая Н.Р., Загадская Г.Я., Іваненка Е.А., Казушчык М.А., Качан В.І., Казак А.Ф., Крыніцкая В.С., Кірэенка В.М., Казаноўская В.Д., Кудраўцава Е.С., Кротаў А.І., Крывеня М.І., Касцюк М.П., Квач Б.Л.,*



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

*Котава А.Ф., Лешчына С.Б., Лук'янчык М.І., Леус А.П., Лакцевіч В.Я., Легчанка Н.М., Мельнікаў В.І., Мулінскі В.А., Мікша В.А., Мікша С.А., Мальцава Н.Н., Макацерскі Л.Г., Маёр А.Г., Мілеўскі У.І., Мудрая А.В., Асноўчык К.І., Аверчук В.А., Альшэўскі П.І., Пончанка А.Ф., Парынава (Вінаградава) В.М., Паўлючэнка А.Ф., Прахін У.В., Пузанкоў А.П., Пятроўская А.У., Петкевіч Р.Г., Рабцэвіч Г.П., Раманчук Т.В., Рыжкова Н.А., Рогаў І.Я., Сехові́ч (Пончанка) З.А., Светагор А.П., Саковіч (Палкоўнікава) В.П., Самойла В.І., Смалякова Л.А., Сушчэўская А.І., Сычова З.Д., Славінская Г.А., Станулевіч (Гражынская) Л.С., Сушчэвіч А.У., Ткачова (Рабцэвіч) Т.А., Таміла А.А., Трапезнікава (Маёр) І.М., Цітоў Л.І., Улановіч (Мілеўская) Г.П., Хацкевіч Л.Ф., Шыла І.П., Шаланда Г.А., Шархіна М.К., Шагавікова Н.Я., Шубік К.Б., Шчапіла В.А., Чаган У.С., Яечанка І.У.*

УДК 630 245

## ОБОСНОВАНИЕ МЕХАНИЗИРОВАННЫХ ОСВЕТЛЕНИЙ ЛЕСНЫХ КУЛЬТУР

**П.В. Колодий, Е.С. Козлова**
УО «Гомельский государственный университет им. Ф. Скорины» (Республика Беларусь, 246028, г. Гомель, ул. Советская, 104; e-mail:kolody@gsu.by)

Аннотация. В работе показана взаимосвязь образования, производства и элементов научных исследований при подготовке инженеров лесного хозяйства. Отмечено, что использование лесных мульчеровможет быть эффективно на 75 % лесных площадей смешанных сосновых культур.
Ключевые слова: лесные культуры, осветление, кусторез, ширина междурядья, исследования, эффективность.

## JUSTIFICATION OF MECHANIZED LIGHTENING OF FOREST PLANTATIONS

**P.V. Kalodziy, E.S. Kazlova**
EI «FranciskSkorina Gomel State University» (Belarus, Gomel, 246028, 104 Sovetskayast.; e-mail: kolody@gsu.by)

Summary. The relationship between education, production, and elements of scientific research in the training of forestry engineers is shown in the work. It is noted that the usage of forest mulchers can be effective on 80% of forest areas of mixed pine crops.
Key words: forest plantations, lightening, brush cutter, row spacing, research, efficiency.

Ежегодно в Беларуси заготавливается более 25 млн. м$^3$ древесины. На вырубленных участках восстанавливают лесные насаждения путем создания лесных культур. Процесс лесовосстановления сложный и включает ряд этапов: подготовка почвы, посадка сеянцев или саженцев



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ